А.В. Шарапава (Магілёў)

# ВЫВУЧЭННЕ ТВОРЧАСЦІ ВІТАЛЯ ВОЛЬСКАГА Ў КАНТЭКСЦЕ ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ “ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА”: ТЭАРЭТЫЧНЫ І ЖАНРАВЫ АСПЕКТЫ

Пры рэалізацыі адукацыйнай праграмы па спецыяльнасці “Пачатковая адукацыя” важнае месца займае вучэбная дысцыпліна “Дзіцячая літаратура”. *“Выпускнік павінен ведаць асноўныя этапы і кірункі развіцця дзіцячай літаратуры розных краін; асноўныя літаратуразнаўчыя паняцці, неабходныя для самастойнага аналізу і ацэнкі мастацкіх твораў, жанравую і ідэйна-мастацкую своеасаблівасць твораў, што ўвайшлі ў кола дзіцячага чытання <…>”*[1] [2, с. 3]. Фарміраванню падобных кампетэнцый садзейнічаюць розныя метады працы студэнта і выкладчыка. У такім кантэксце важным элементам педагагічнай сістэмы з’яўляецца літаратурная спадчына Віталя Вольскага. Манаграфічнае вывучэнне яго творчасці тыпавой вучэбнай праграмай № ТД-А.375/тып. не прадугледжваецца, але пэўныя тэксты пісьменніка згадваюцца ў межах аглядавых тэм. Таму пры вывучэнні творчасці Вольскага, асэнсаванні яе як цэласнай з’явы важнае значэнне набывае самастойная работа студэнтаў, для якой выкладчык не толькі рыхтуе комплекс пытанняў і заданняў, але і вызначае яе мэты, задачы і перспектывы. Улічваючы спецыфіку творчасці пісьменніка, знаёмства з яго творамі мэтазгодна праводзіць па жанравым прынцыпе. Зыходзячы з гэтага, студэнтам нагадваюцца такія паняцці, як “род”, “эпас”, “драма” “жанр”, “драматургічная казка”, “апавяданне”, “нарыс”, “публіцыстыка” і інш.

Пры вывучэнні тэмы “Дзіцячая літаратура ў 30-я гг. 20 ст.”, на якую праграмай адводзіцца 1 гадзіна лекцыйная і 1 гадзіна практычная[2], сярод іншых прапануецца разгледзець такое пытанне “Дзіцячая драматургія: п’есы “Цудоўная дудка”, “Дзед і жораў” (абедзве пастаўлены ўпершыню ў 1939) В. Вольскага”. Мэтазгодна 1 практычную гадзіну адвесці на вывучэнне драматургічнай спадчыны пісьменніка для дзяцей, што абумоўлена, па-першае, значнасцю літаратурнага матэрыялу, па-другое, адпавядае патрабаванням тэарэтычнай літаратуразнаўчай падрыхтоўкі студэнтаў. На практычных занятках прапануюцца наступныя пытанні для вывучэння і абмеркавання, а таксама практыкаванні да іх. *1. П’есы-казкі “Цудоўная дудка”, “Дзед і жораў” (абедзве – паст. 1939). 2. П’еса-казка “Несцерка” (паст. 1941).* <u>Практыкаванне 1.</u> Прачытайце названыя п’есы. Назавіце тыя фальклорныя казкі, якія, на вашу думку, былі пакладзены ў аснову п’ес, свой адказ абгрунтуйце. Падумайце, якая тэматычная група казак найбольш актыўна выкарыстоўвалася аўтарам. Вывады занатуйце. <u>Практыкаванне 2.</u> У сшытках самастойнай работы запішыце імёны персанажаў драматургічных тэкстаў, побач − вызначальныя рысы іх характару, напрыклад, Несцерка − добры, вынаходлівы, Мацей − разважлівы, але бесхарактарны і г. д. Свае

[1] Пераклад з рускай мовы аўтара гэтага даследавання.
[2] Тут і далей указанне гадзін і праграмны змест даюцца па наступнай крыніцы: [2, с. 26].

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

назіранні падмацуйце прыкладамі. На аснове гэтага практыкавання зрабіце вывад адносна прыёмаў выяўлення аўтарскай пазіцыі ў драматургічным творы. Практыкаванне 3. (высокага прадуктыўнага ўзроўню). Падрыхтуйце паведамленне пра сцэнічнае ўвасабленне п’ес В. Вольскага. Раскажыце пра іх кінематаграфічнае (мастацкі фільм-казка “Несцерка” (1955), сцэнар В. Вольскага, рэжысёр А. Зархі) і мультыплікацыйнае (стужка “Несцерка” (1980), сцэнар В. Вольскага, А. Белавусава, рэжысёр Я. Ларчанка; стужка “Несцерка” (2003 − 2013), што складаецца з 8 асобных частак, рэжысёр І. Воўчак) увасабленне. Падрыхтуйце свой сцэнар адной з п’ес пісьменніка (па выбары) для пастаноўкі ў пачатковай школе.

На вывучэнне тэмы “Дзіцячая літаратура першага пасляваеннага дзесяцігоддзя” праграма адводзіць 2 лекцыйныя і 1 практычную гадзіны. У межах лекцыі сярод іншых разглядаецца пытанне “Краязнаўчыя нарысы В. Вольскага “Па лясных сцежках” (1948), “У лясах над Бярозай” (1955)”. Лекцыя, акрамя агульнай характарыстыкі раздзелаў тэкстаў, прадугледжвае актуалізацыю такіх паняццяў, як “публіцыстыка”, “краязнаўчы нарыс” і інш. Першаснае знаёмства з новай, для студэнтаў названай спецыяльнасці, жанравай формай будзе падтрымана ў межах тэмы “Дзіцячая літаратура 1965 – 1985 гг.” (2 лекцыйныя, 2 практычныя гадзіны), дзе праграмны змест вылучае такія аспекты творчасці В. Вольскага: “Навукова-пазнавальная літаратура. Элементы публіцыстыкі ў ёй. Краязнаўчыя кнігі В. Вольскага “Падарожжа па краіне беларусаў” (1968), “Палессе” (1971) і інш.” Адну з практычных гадзін мэтазгодна адвесці пад разгляд названага праграмнага матэрыялу. Такім чынам, выкладчык можа рэалізаваць прынцыпы сістэмы перспектыўных ліній, калі да вядомых ведаў можна вярнуцца, паглыбіць іх, падмацаваўшы новым матэрыялам. На практычныя выносяцца наступныя пытанні і практыкаванні да іх. *1. “Падарожжа па краіне беларусаў” (1968) Віталя Вольскага як мастацкая энцыклапедыя Беларусі.* Практыкаванне 1. Выпішыце ў “Слоўнік літаратуразнаўчых тэрмінаў”[3] азначэнні паняццяў “публіцыстыка”, “нарыс”, “краязнаўчы нарыс”. Практыкаванне 2. Прачытайце прапанаваны тэкст. Вызначце тыя яго асаблівасці, што дазваляюць аднесці твор а) да навукова-пазнавальнай літаратуры, б) да публіцыстыкі. Практыкаванне 3. У сшытках намалюйце табліцу, першы слупок якой − дата ў гісторыі, другі − цытата з тэксту, што найбольш паказальна ілюструе яе. Падрыхтуйце прэзентацыю, у якой былі б змешчаны сучасныя і мінулыя выявы беларускіх гарадоў, згаданых у тэксце. Практыкаванне 4. Параўнайце асаблівасці адлюстравання флоры і фаўны Беларусі ў “Падарожжы па краіне беларусаў” і ва ўжо вядомых тэкстах “Па лясных сцежках”, “У лясах над Бярозай”. Вызначце у сувязі з гэтым мастацкія задачы твора. Практыкаванне 5. Ахарактарызуйце спосаб кампазіцыйнай арганізацыі кнігі. Патлумачце, чаму пісьменнік абраў незвычайны спосаб падачы матэрыялу − падарожжа на дыване-кіліме. Параўнайце яго са спосабам падачы матэрыялу ва ўжо вядомым для вас

[3] Вядзецца студэнтамі на працягу ўсяго часу вывучэння дысцыпліны.

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

нарысе Ул. Караткевіча “Зямля пад белымі крыламі”. Практыкаванне 6. (высокага прадуктыўнага ўзроўню) Звярніцеся да кнігі для чытання па айчыннай гісторыі “Старонкі нашай гісторыі”(1966), якую В. Вольскі пісаў спецыяльна для вучняў чацвёртага класа. Зрабіце высновы адносна спецыфікі адлюстравання рэчаіснасці ў кнізе ў параўнанні з “Падарожжам па краіне беларусаў”. *2. Паэтызацыя старажытных мясцін Беларусі ў дакументальнай аповесці В. Вольскага “Палессе”(1971).* Практыкаванне 1. Прачытайце твор. Узгадайце ўжо вядомую для вас аповесць Янкі Маўра “Палескія рабінзоны”. Зрабіце вывады адносна асаблівасцяў прыгодніцкага і навукова-папулярнага апісання пэўнага рэгіёна, перспектыў выкарыстання падобных матэрыялаў на ўроках у пачатковай школе. Падрыхтуйце план-канспект урока (дысцыпліна па выбары студэнта) з выкарыстаннем фрагментаў названых аповесцяў. Практыкаванне 2. На геаграфічнай карце Беларусі намалюйце маршрут падарожжа апавядальніка па Палессі. Падрыхтуйце невялікае паведамленне пра адзін з населеных пунктаў Палесся (Пінск, Мазыр, Лунінец, Давыд-Гарадок, Лунін і Лахву і інш.). Практыкаванне 3. Акрэсліце праблемнае поле аповесці. Зрабіце вывад адносна актуальнасці краязнаўчых кніг В. Вольскага ў XXI ст.

Самастойная работа студэнтаў выконваецца па наступным алгарытме: выкананне практыкаванняў, пісьмовае іх афармленне ў сшытку для самастойнай работы, праверка выкладчыкам гэтых практыкаванняў (франтальная або выбарачная). Неабходна адзначыць, што змест самастойнай работы вядомы студэнтам ужо з самых першых этапаў вывучэння дысцыпліны. Па творчасці Віталя Вольскага прапануюцца наступныя практыкаванні. *1. Звесткі з біяграфіі Віталя Вольскага (1901 – 1988).* Лепшаму асэнсаванню пытання паспрыяе папярэдняе самастойнае вывучэнне студэнтамі біяграфіі пісьменніка на падставе артыкула з вучэбнага дапаможніка “Беларуская дзіцячая літаратура” [1, с. 358-377]. Сістэматызацыя ведаў рэалізуецца праз запаўненне храналагічнай табліцы. *2. Роля краязнаўчых нарысаў і апавяданняў у выхаванні патрыятычных пачуццяў дзяцей і фарміраванні іх экалагічнай свядомасці (кнігі “Месяц за месяцам: Каляндар беларускай прыроды” (1956), “На бабровых азёрах” (1957), “Чайкі над Нараччу” (1959), “Родны край” (1961), “Афрыканскае падарожжа” (1963), “Эль Махрыб” (1965), “Кніга падарожжаў” (1971), “Лёс Дункана” (1978), “Дзень добры, Бяроза!” (1984)). Спалучэнне этнаграфічнага, літаратурнага, гістарычнага матэрыялу.* Студэнтам прапаноўваецца раздзяліцца на міні-групы, кожная з якіх абірае для чытання і асэнсавання пэўную кнігу пісьменніка. У часе калоквіума адбываецца прэзентацыя яе па наступным алгарытме: гісторыя стварэння, кароткі змест, праблемнае поле, сістэма вобразаў, ідэйны змест, выхаваўча-пазнавальнае значэнне, магчымасці выкарыстання на занятках у пачатковай школе.

Для праверкі ведаў студэнтаў па творчасці В. Вольскага мэтазгодна выкарыстаць комплекс тэставых заданняў, у якіх на адно пытанне даецца чатыры варыянты адказаў, і неабходна выбраць адзін − правільны − адказ.

| | |
|---|---|
| 1. Вызначце гады жыцця Віталя Вольскага | 16. Кніга для чытання па айчыннай гісторыі |

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

| | |
|---|---|
| а) 1904 − 1979;<br>б) 1899 − 1975;<br>в) 1912 − 1995;<br>г) **1901 − 1988**. | В. Вольскага “Старонкі нашай гісторыі” была прызначана для вучняў<br>а) першага класа<br>б) другога класа<br>в) трэцяга класа<br>г) **чацвёртага класа** |
| 2. Дзе нарадзіўся В. Вольскі?<br>а) у Магілёве;<br>б) **у Пецярбурзе**;<br>в) у Вязынцы на Міншчыне;<br>г) у Глінішчах на Гомельшчыне. | 17. Кніга В. Вольскага “Месяц за месяцам” − гэта своеасаблівы варыянт<br>а) падручніка па гісторыі;<br>б) **календара прыроды**;<br>в) хрэстаматыі па літаратуры;<br>г) навуковага даследавання. |
| 3. Культурай якога народа, што здаўна жыў на тэрыторыі Беларусі, яшчэ ў войску зацікавіўся В. Вольскі?<br>а) палякаў;<br>б) **беларускіх татар**;<br>в) яўрэяў;<br>г) літоўцаў. | 18. Апавяданне “Лясны конь” прысвечана такому насельніку Белавежскай пушчы, як<br>а) **тарпану**;<br>б) мустангу;<br>в) ахалтэкінцу;<br>г) камаргу. |
| 4. У якім літаратурным жанры, папулярным у мастацкай літаратуры XIX ст., актыўна праявіў сябе В. Вольскі?<br>а) апавяданне;<br>б) балада;<br>в) **нарыс**;<br>г) паэма. | 19. Дункан з апавядання “Лёс Дункана” − гэта<br>а) леў;<br>б) тыгр;<br>в) рысь;<br>г) **леапард**. |
| 5. Мастацкі нарыс “Па лясных сцежках” прысвечаны<br>а) **Белавежскай пушчы**;<br>б) Бярэзінскаму біясфернаму запаведніку;<br>в) Браслаўскім азёрам;<br>г) Палессю. | 20. Пра якога драпежніка расказваецца ў апавяданні “Трохлапы” ?<br>а) рысь;<br>б) **воўк**;<br>в) мядзведзь;<br>г) лісіца. |
| 6. Мастацкі нарыс “У лясах над Бярозай” прысвечаны<br>а) Белавежскай пушчы;<br>б) **Бярэзінскаму біясфернаму запаведніку**;<br>в) Браслаўскім азёрам;<br>г) Палессю. | 21. Як звалі караля з п’есы В. Вольскага “Цудоўная дудка” ?<br>а) Карл;<br>б) Пётр;<br>в) Жыгімонт;<br>г) **Дурымонт**. |
| 7. Пра якую частку Афрыкі расказвае В. Вольскі ў кнізе “Афрыканскае падарожжа”?<br>а) **Заходнюю**;<br>б) Усходнюю;<br>в) Паўднёвую;<br>г) Паўночную. | 22. Астролаг задаў Янку (п’еса “Цудоўная дудка”) тры філасофскія пытанні: “Што ў свеце самае салодкае? Што ў свеце самае хуткае? Што ў свеце самае багатае?”. Якім быў адказ Янкі?<br>а) цукеркі, час, золата;<br>б) мёд, вецер, зямля;<br>в) **сон, думкі, зямля**;<br>г) мёд, думкі, золата. |
| 8. Пра якую частку Афрыкі расказвае В. Вольскі ў кнізе “Эль-Махрыб”?<br>а) Заходнюю;<br>б) Усходнюю;<br>в) Паўднёвую;<br>г) **Паўночную**. | 23. Хто псуе агарод дзеду і бабе у п’се “Дзед і Жораў”?<br>а) конь;<br>б) **жораў**;<br>в) селянін;<br>г) пан. |
| 9. Цячэнне якой ракі вызначыла кірунак аповеду ў кнізе “Палессе”<br>а) Дзвіна;<br>б) Свіслач;<br>в) Нёман;<br>г) **Прыпяць**. | 24. Што падараваў дзеду жораў першы раз у знак удзячнасці за тое, што той яго адпусціў?<br>а) ражок;<br>б) **торбачку**;<br>в) дудку;<br>г) меч. |
| 10. Пан Зыгмусь, персанаж кнігі “Палессе”, закранае адну з важных экалагічных праблем. Назавіце яе<br>а) аварыя на ЧАЭС;<br>б) **меліярацыя**; | 25. Што падараваў дзеду жораў у другі раз (п’еса “Дзед і жораў”)?<br>а) **ражок**;<br>б) торбачку; |

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета

| | |
|---|---|
| в) вырубка лясоў;<br>г) браканьерства. | в) дудку;<br>г) меч. |
| 11. У “Палессі” называецца былы цэнтр былой Палескай вобласці − горад<br>а) Давыд-Гарадок;<br>б) Лунінец;<br>в) **Мазыр**;<br>г) Пінск. | 26. Пан Бараноўскі пры першай сустрэчы падумаў, што Несцерка<br>а) **рымар**<br>б) цясляр<br>в) карчмар<br>г) ганчар |
| 12. У кнізе “Падарожжа па краіне беларусаў” адлюстраваны палёт на<br>а) цмоку;<br>б) **дыване-кіліме**;<br>в) фантамабілі;<br>г) ракеце. | 27. Пан Самахвальскі і “пан Несцяровіч” у п’есе В. Вольскага “Несцерка” дыспутавалі<br>а) словамі;<br>б) артыкуламі;<br>в) **жэстамі**;<br>г) мімікай. |
| 13. Кніга “На бабровых азёрах” адлюстроўвае басейн такой беларускай ракі, як<br>а) **Нёман**<br>б) Днепр<br>в) Сож<br>г) Заходняя Дзвіна | 28. Хто выратаваў Насцю з лап мядзведзя (п’еса “Несцерка”)?<br>а) шкаляр Самахвальскі;<br>б) Несцерка;<br>в) **Юрась**;<br>г) Мацей. |
| 14. У кнізе “На бабровых азёрах” узгадваюцца баброўнікі. Хто гэта?<br>а) бабры<br>б) **спецыялісты па лоўлі баброў**;<br>в) грыбы;<br>г) месца, дзе жывуць бабры. | 29. Хто ў п’есе “Несцерка” увасабляе сабой псеўдавучонасць?<br>а) **шкаляр Самахвальскі**;<br>б) Несцерка;<br>в) Юрась;<br>г) Мацей. |
| 15. У кнізе “На сініх азёрах” расказваецца пра блізкага родзіча бабра, прывезенага ў Беларусь з Паўночнай Амерыкі. Гэта<br>а) выдра<br>б) **андатра**<br>в) нутрыя<br>г) сурок | 30. Суаднясіце імя персанажа і назву п’есы В. Вольскага. Выберыце правільную паслядоўнасць літар і лічбаў: А) Янка, Б) Баба, В) кароль Дурымонт, Г) шкаляр Самахвальскі, Д) дзеўка Ульяна; 1) “Несцерка”, 2) “Дзед і жораў”, 3) “Цудоўная дудка”, 4) “Машэка”, 5) інтэрмедыя з п’есы “Несцерка”.<br>а) А1 Б5 В2 Г3 Д4;<br>б) А1 Б2 В3 Г4 Д5;<br>в) А3 Б5 В2 Г1 Д4;<br>г) **А3 Б2 В3 Г1 Д5**. |

Такім чынам, прапанаваная сістэма вывучэння тэмы творчасці В. Вольскага спрыяе фарміраванню ў будучага педагога належных кампетэнцый, садзейнічае найбольш поўнаму выяўленню здольнасцяў студэнтаў, а таксама своечасоваму правядзенню папераджальных і карэктуючых дзеянняў, уцягвае ў працэс пазнання ўсіх навучэнцаў. Разам з тым, студэнты атрымліваюць належныя веды тэарэтычнага характару, асэнсоўваюць жанравую разнастайнасць айчыннай літаратуры, вобразна-выяўленчае багацце беларускай мовы. Выкарыстаныя метады і прыёмы, заданні, тэсты могуць стаць метадычным падмуркам будучай прафесійнай дзейнасці сённяшніх студэнтаў.

## ЛІТАРАТУРА

1. Беларуская дзіцячая літаратура : вучэб. дапам. / А.М.Макарэвіч [і інш.]; пад агул. рэд. А.М.Макарэвіча, М.Б.Яфімавай. – Мінск : Выш. шк., 2008. – 688 с.

2. Детская литература : типовая учебная программа для высших учебных заведений по специальностям : 1 – 01 02 01 Начальное образование; 1 – 01 02 02 Начальное образование. Дополнительная специальность / сост. С.Н. Дворецкая, О.Б. Нестерович. – Минск, 2011. – 41 с.

Электронная библиотека Белорусско-Российского университета